«Народная Воля» в Facebook www.facebook.com/nv.online.info,
в Vkontakte www.vk.com/nvonlineinfo

№ 56 (4616)

27 ліпеня 2021 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...*
Якуб КОЛАС

Дзякуй усім, хто падтрымлівае «Народную Волю» ў гэты надзвычай цяжкі час.
Рэдакцыя.

БЛІЦ

“Такім чынам, восьмы дзень нашы калегі знаходзяцца ў тым самым адзенні, у якім іх затрымалі, нягледзячы на невыносную спёку, якая стаіць гэтымі днямі. У іх няма ні зменнай бялізны, ні элементарных сродкаў гігіены, ні дадатковай ежы і пітва. Куды падзеліся перадачы, якія сваякі куплялі за свае грошы і перадавалі, невядома. Гуманітарныя наборы, якія на Акрэсціна перадае “Чырвоны Крыж”, затрыманым таксама не даюць. Людзі ў ізалятары спяць на падлозе або на шконках без бялізны і матрасаў. Усё гэта з’яўляецца грубым парушэннем закону і ўнутраных правілаў ІЧУ”.

(З нядаўняга паведамлення тэлеграм-канала “Наша ніва”)

“Змяніў тры камеры. Спачатку сядзеў у чатырохмеснай, дзе было 16 чалавек і тэмпература за +40. У камеры ўсе былі ў адной бялізне абсалютна мокрыя, было цяжка дыхаць і проста варушыцца. Потым перавялі ў аднамесны карцэр, дзе было яшчэ восем чалавек, адсутнічаў ложак, а на падлозе была плітка. Затым – у іншую чатырохмесную камеру, дзе нас было дванаццаць. У рэшце рэшт вярнулі ў першую камеру, дзе было ўжо 18 чалавек.

Перапоўненасць камер такая, што месца хапае роўна на тое, каб усім змясціцца спаць на падлозе. Калі некага вызвалялі, то хутка прыводзілі новых людзей. Пры гэтым, у ЦІП дакладна ёсць пустыя камеры. Бялізну і матрацы не выдаюць, большасць спіць на падлозе, гэта камфортней, чым на жалезных нарах.

Асабістыя рэчы ўзяць з сабой у камеру не дазваляюць, перадачы ад сваякоў прымаюць, але не перадаюць – аддаюць, калі вызваляешся (так што, калі сутыкнецеся, перадаваць перадачы цяпер няма сэнсу). У выніку амаль усе сядзяць без зменнай бялізны, адзення, зубной шчоткі, ручніка, не кажучы ўжо пра кнігі.

За 10 дзён у душ не вадзілі ні разу, мы мыліся з бутэлек над унітазам. Адбой у 22, пад’ём – а 6-й раніцы, днём ляжаць нельга. Кожную ноч камеру будзяць два разы, у 2 і 4 гадзіны, каб зладзіць пераклічку. Выспацца, такім чынам, не ўдаецца, стомленасць назапашваецца.

Аслабляецца імунітэт, многія хварэюць. Я страціў нюх, хоць і вакцынаваны. Пасля выхаду на волю тэст на каранавірус апынуўся станоўчым”.

(З інтэрв’ю Вадзіміра Заранкіна, супрацоўніка амбасады ЗША ў Беларусі, старэйшага сына былога кіраўніка Віцебска; адсядзеў у ліпені 10 сутак на Акрэсціна)

Пагадзіцеся, нельга прачытаць гэтыя радкі і зрабіць выгляд, што нічога незвычайнага ў краіне не адбываецца. Таму “Народная Воля” звярнулася да шэрагу вядомых асоб з такім пытаннем:

Як спыніць катаванні людзей у ізалятары часовага ўтрымання?

Алена АНІСІМ, старшыня ГА “Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны”, экс-дэпутат Палаты прадстаўнікоў:



– Па праўдзе кажучы, складана сказаць… Сітуацыя ўвогуле невытлумачальная… Каб у той краіне, якая найбольш пацярпела па ўсіх аб’ектыўных ацэнках ад фашыстаў у гады вайны, сёння, праз 30 гадоў незалежнасці, у месцах зняволення з людзей так здзекаваліся… Проста за тое, што людзі інакш думаюць і хочуць, каб краіна была вольнай, незалежнай і паспяховай.

Цяжка сказаць, як на гэта можна паўплываць… Магчыма, чыста чалавечыя звароты на адрас улады змогуць змяніць такое стаўленне да зняволеных. І зразумела, што кожны такі факт жорсткага абыходжання павінен рабіцца публічным.

Даўно стіць пытанне пра бесчалавечныя ўмовы ўтрымання ў турмах і ізалятарах, і я лічу, што для новай улады гэта будзе адно з найпершых пытанняў.

Алег РУМО, дырэктар дзяржаўнай установы «Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, трансплантaлогіі і гематалогіі», член Савета Рэспублікі:



– Я хвалююся пра здароўе ўсіх людзей.

Усяго добрага, да пабачэння.

Сяргей ЗАКОННІКАЎ, паэт, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі:



– Ніяк. Я заўсёды рэальна гляджу на рэчы. Яшчэ у 1993 годзе пісаў пра тое, чым усё можа скончыцца, калі Лукашэнка яшчэ толькі намерваўся пайсці ў прэзідэнты. Я не радуюся таму, што мае прадбачанні здзейніліся, але ў сённяшняй сітуацыі грамадства абсалютна нічога не можа зрабіць. Што хацелі, тое і атрымалі. Цяпер можна толькі рукамі развесці…

Вадзім ГІГІН, палітолаг, публіцыст, дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ:



– Прабачце, я сяджу на прыёме дакументаў – сёння апошні дзень. Вельмі шмат абітурыентаў, вялікі наплыў паступаючых. У іншы раз патэлефануйце, я падумаю...

Вольга АБРАМАВА, экс-дэпутат Вярхоўнага Савета і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:



– Калі б я ведала рэцэпт!...

У бытнасць дэпутатам, турмы – гэта быў адзін з маіх прыярытэтаў. Я ўвесь час дамагалася лібералізацыі ўмоў знаходжання ў месцах пазбаўлення волі, патрабавала змяніць падыходы адпраўлення людзей у месцы зняволення, у тым ліку і па палітычных матывах. Я патрабавала паляпшэння ўмоў знаходжання ў месцах пазбаўлення волі, у тым ліку гэта тычылася пытанняў харчавання і меддапамогі.

Зараз я нават не ведаю, што можна зрабіць. Не ўяўляю, каб хтосьці мог рэальна і сістэмна працаваць у гэтым накірунку – пра дэпутатаў я наогул не кажу, сёння гэта не ў іх сферы інтарэсаў. Я за апошнія гады не сустракала, каб хоць хто-небудзь з дэпутацкага корпуса падымаў гэтае пытанне. Хаця нам у свой час многае ўдавалася. Мы за свае грошы ў 2007 годзе, напрыклад, куплялі кнігі ў турмы – адбіралі іх па кніжных кірмашах. Мы дамагліся павялічэння асігнаванняў на харчаванне зняволеных – яно было проста паталагічна дрэнным.

Людзі абураюцца тым, што адбываецца ў ізалятарах, але разумеюць, што яны нямоглыя і не ў сілах нешта змяніць. Трэба прыняць кардынальнае рашэнне на дзяржаўным узроўні – спыніць пераслед людзей па надуманых прычынах, не ствараць нечалавечыя ўмовы існавання ў ізалятарах і турмах. Але каб з’явілася гэтая палітычная воля, павінна нешта змяніцца: альбо знешні ціск на дзяржаву прымусіць гэта зрабіць, альбо, як той казаў, у самой кансерваторыі нешта павінна памяняцца…

Калісьці з трыбуны Палаты прадстаўнікоў я публічна звярнулася да ўсіх прысутных у Авальнай зале з нагоды неабходнасці радыкальнай змены стаўлення да зняволеных у турмах. Я тады прапанавала ўсім чыноўнікам і дэпутатам на добраахвотнай аснове правесці адзін поўны дзень ва ўмовах турэмнага ўтрымання. Каб на сабе адчулі усё тое, што кожны дзень адчуваюць зняволеныя. “Вось тады, магчыма, вы зразумееце, што такое сапраўдная несвабода і будзеце ставіцца да гэтага адпаведна, прымаючы нейкія дзяржаўныя рашэнні”, – сказала я. І нас вадзілі на экскурсію ў турмы і ізалятары, але гэтага было недастаткова. На сваёй скуры гэта трэба выпрабаваць, каб зразумець і пранікнуцца.

Дзмітрый БРЫЛЁЎ, намеснік начальніка ўпраўлення ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі і рэдакцыйнай дзейнасці – афіцыйны прадстаўнік Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь:



– Калі ўсё гэта насамрэч адпавядае рэчаіснасці, то ў чалавека ніхто не адбіраў права паведаміць пра гэта праз інстытут скаргаў.

Мы, безумоўна, таксама адсочваем сродкі масавай інфармацыі, і магу падзякаваць вам за гэты маячок, звернем увагу. Але калі журналіст звяртаецца – гэта крыху не тое. Зараз любую інфармацыю трэба перапраўяраць, вельмі шмат фэйкаў. А закон аб зваротах грамадзян ніхто не адмяняў, ён працуе. І той, хто канкрэтна пацярпеў, можа накіраваць зварот у адпаведныя органы. Іншае пытанне, чаму не адпраўляе. Не жадае або няма падстаў? Трэба разбірацца... Я, канешне, паведамлю пра гэта сваім калегам, якія нагляд ажыццяўляюць. Але і самі людзі павінны паказаць, калі, у які перыяд часу, што ім не далі, у чым канкрэтна парушаныя іх правы.

Апытанне праводзілі Марына КОКТЫШ і Алена МАЛОЧКА.

З-ЗА КРАТ

Пасля 10 дзён у турме на Акрэсціна на волю выйшлі журналісты Радыё Свабода Іна Студзінская і Алег Груздзіловіч.

Алеся Дашчынскага выпусцілі з-за крат раней, 23 ліпеня.

Іну Студзінскую, Алега Груздзіловіча і Алеся Дашчынскага затрымалі пасля ператрусаў у іх дамах 16 ліпеня. Тады ж рэдакцыйны офіс у Мінску быў ускрыты і разгромлены.

Нікому з затрыманых не выставілі ніякіх абвінавачаанняў, яны застаюцца падазраванымі. Праваабаронцы прызналі іх палітычнымі вязнямі.

Пратэстуючы, Студзінская галадала больш за тыдзень



Іна Студзінская пасля вызвалення паведаміла, што яна, пратэстуючы, галадала больш за тыдзень, ніводнага допыту не было, працэсуальнага статусу яна не мае, ніякага абвінавачвання ёй не выставілі. Перад вызваленнем яна падпісала паперу аб яўцы. Прынцыпова адмовілася падпісваць паперу аб невыдаванні.

“І ў турме можна выжыць. Але нары былі цвёрдыя, матраца і падушкі не далі, да чацвярга я была ў тым жа адзеньні, у якім забралі. Абмылак быў за шчасце. Я галадала ў знак пратэсту, перадачу мне перадалі ў чацвер, але яе з’елі сукамерніцы. Я піла ваду. Было фактычна катаванне святлом – гарэлі ўвесь час тры яркія лямпы – і гучнай музыкай: уключалі гімн і песні “Саня астанецца с намі”, “Любімую не аддаюць”; але і было дзве песні ў выкананні Данчыка”, – распавяла Іна Студзінская.

«Гэта дэманстратыўна грубае абыходжанне з людзьмі, затрыманымі па палітычных артыкулах»



Алег Груздзіловіч пасля вызвалення з турмы на Акрэсціна сказаў, што застаецца падазраваным і што ён даў падпіску аб яўцы. Тры дні ён галадаў за кратамі ў знак пратэсту супраць затрымання і салідарнасці з Інай Студзінскай, якая галадала больш за тыдзень з патрабаваннем дапусціць да яе адваката.

Алег Груздзіловіч паведаміў пасля вызвалення, што мае статус падазраванага па артыкуле 342 Крымінальнага кодэксу (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх; караюцца арыштам, ці абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў).

Ніводнага допыту ў Алега не было, ён адмовіўся даваць паказанні падчас затрымання, не падпісаў пратакол ператрусу 16 ліпеня. У Следчым камітэце 16 ліпеня яго спрабавалі дапытаць, але ён адмовіўся ад дачы паказанняў.

“У Следчым камітэце ў кабінетах усё завалена кампутарамі і бел-чырвона-белай сімволікай. Там мне прапанавалі допыт, але я адмовіўся. Дзяжурны адвакат, якога мне далі, так і не паведаміў жонцы, што мяне накіравалі ў турму на Акрэсціна, аб чым я яго прасіў”.

26 ліпеня Алег Груздзіловіч перад вызваленнем даў падпіскі аб яўцы і невыдаванні матэрыялаў справы.

“Абставінаў справы я паведаміць не магу, але я іх і не ведаю, ведаю, што там шмат людзей – гэта тое, што я чуў ад сукамернікаў. Апрача таго, у камерах была вялікая колькасць людзей, затрыманых у так званай “вілейскай справе” (падазрэнне на тэрарызм), некаторых з іх таксама адпускаюць”.

Алег тры дні, да вызвалення, трымаў галадоўку пратэсту. Перадачу ён атрымаў толькі па вызваленні, ні матраца, ні падушкі, ні бялізны не меў, прагулак не давалі, яшчэ не вярнулі пашпарт.

“Гэта дэманстратыўна грубае абыходжанне з людзьмі, затрыманымі па палітычных артыкулах. У “непалітычных” матрацы былі. Стаўленне да нас сярэдняе, але агулам можна сказаць, што міліцыянты настроеныя даволі жорстка да палітычных. Толькі адзін выказаў маленькае спачуванне. Усе астатнія былі вельмі жорстка настроеныя.

Гэта робіцца, каб уздзейнічаць на палітычных. Ім ствараюць невыносныя ўмовы з самага пачатку. Усе палітычныя вязні кажуць, што мы закладнікі гэтай сітуацыі. Я разумею, што быў загад пакуль прыпыніць гэтую справу. Якое будзе развіццё, залежыць ад палітычнай сітуацыі”.

Учора раніцай таксама вызвалілі журналіста «Белсата» Ігара Ільяша

Журналіст тэлеканала «Белсат» Ігар Ільяш пасля 10 сутак зняволення.



Ігар Ільяш – журналіст, які спецыялізуецца на расследаваннях, аўтар кнігі «Беларускі Данбас» і муж палітзняволенай журналісткі **Кацярыны Андрэевай (Бахвалавай)**. Яго затрымалі 16 ліпеня, толькі праз чатыры дні да яго дапусцілі адваката.

23 ліпеня стала вядома, што Ільяш з’яўляецца падазраваным паводле ч.1 арт.342 КК (“Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх”).

***

За кратамі па-ранейшаму застаюцца дзясяткі прадстаўнікоў незалежных СМІ Беларусі.

РУБАМ!

Спадар Швед, а дзе крымінальныя справы супраць тых, хто займаўся фальсіфікацыямі вынікаў выбараў?

Учора генеральны пракурор Беларусі Андрэй Швед даў справаздачу Аляксандру Лукашэнку аб палітычна матываваных крымінальных справах.

“На сённяшні дзень пачата больш за 4200 крымінальных справаў, звязаных з антыграмадскімі праявамі. У суды ўжо накіраваныя 803 крымінальныя справы ў дачыненні да 1116 чалавек, разгледжаны 704 крымінальных справы ў дачыненні да 955 асобаў”, – цытуе генпракурора БелТА.

Што і казаць, уражлівыя лічбы! Але скажыце, спадар генеральны пракурор, ці прыцягнулі вы да адказнасці хоць аднаго з тых, хто нахабна фальсіфікаваў вынікі галасавання падчас прэзідэнцкіх выбараў? Абнародавана мноства дакументальных сведчанняў парушэння заканадаўства, а пракуроры – ні гу-гу.

А колькі чалавек загінула, адстойваючы справядлівасць і дэмакратычныя прынцыпы? Дзе крымінальныя справы ў дачыненні да вінаватых у гібелі людзей? Дык чаму вы пра гэта не сказалі А.Лукашэнку?

Народная Воля
http://www.nv-online.info
27 ЛІПЕНЯ 2021 г.

АТЫ-БАТЫ

Егор ЛЕБЕДОК:

«Всё, что здесь происходит, меня не пугает и не напрягает»

Заведующий лабораторией в ГНПО «Оптика, оптоэлектроника и лазерная техника», автор популярного телеграм-канала о военной и информационной безопасности Беларуси ***Егор Лебедок*** *сообщил, что его призывают на военные сборы. «Народная Воля» уточнила, готов ли морально популярный военный эксперт снова пойти в армию.*



– Егор, почему вдруг именно вас на сборы позвали? Настроены снова отправиться на армейскую практику?

– Готов, конечно! Я же военнообязанный. Думаю, в сентябре-ноябре заберут – пока не понятно, когда точно. Сейчас медкомиссию прохожу. Но это плановые сборы, ничего экстраординарного я здесь не вижу. Часть моих однокурсников, которые не служили, еще прошлой осенью забирали на такие учебные сборы – они прошли переподготовку по новым специальностям.

– Месяц в армии?

– 25 дней. У политолога Артема Шрайбмана тоже были плановые сборы – минувшей осенью гребли всех подряд. В военкоматах никто никого не выделяет персонально. Им вообще без разницы, кто ты и что. Выбирают кандидатов из тех, кто подходит по возрасту, по разряду запаса, по специальности. В моем случае, например, от военкомата надо пять человек отправить, но отобрали восемь. Кто-то, возможно, отсеется на медкомиссии. А в других военкоматах, может, наоборот, некомплект.

Есть у нас проверочные сборы, когда призывают в часть для развертывания, для проведения каких-то учений. А есть учебные сборы (туда и меня собираются направлять) – это просто в Военной академии сидишь и получаешь, условно говоря, новую специальность и новые знания.

– Вы же в армии служили?

– Да, в артиллерийских войсках.

– В последнее время вас начали частенько вспоминать в некоторых провластных телеграм-каналах: мол, что за военный эксперт такой-сякой? Не боитесь столь пристального внимания к своей персоне? Смотрю, вам даже комментаторы в «Фейсбуке» пишут: мол, как-то беспокойно за вас…

– А чего бояться? Мы же в Беларуси живем, если бояться, то можно либо шизануться, либо податься в эмиграцию.

Всё, что здесь происходит, меня не пугает и не напрягает. Я прекрасно понимаю, что будет еще хуже, но меня это не страшит, как всех остальных.

– Многие действительно теперь живут в состоянии непроходящего напряжения и стресса.

– Это глупо, потому что напряжение будет только нарастать. Нужно просто понять, где ты живешь, что может тебя ждать, и расслабиться.

– А почему вы думаете, что дальше будет только хуже?

– А вы разве видите какие-то симптомы улучшения? Я не вижу. Всё – как у Оруэлла написано: репрессии ради репрессий, пытки ради пыток, власть ради власти. И это уже не метафора, а точное описание сути таких режимов, как белорусский.

– Тысячи белорусов за последнее время уехали из страны, опасаясь репрессий. Вы для себя рассматриваете возможность релокейта?

– Конечно, нет! Я уже сказал, что не уеду. Нужно же и мужество иметь, а то попривыкали съезжать…

Я понимаю еще тех, кому действительно угрожают, а тут смотришь по соцсетям – некоторые в какой-то непонятной истерике уезжают: ай-яй, со мной тут такое могут сделать!.. Ну посадят и посадят – не ты первый, не ты последний.

– У вас дети есть, жена?

– Нет. Мне в этом смысле, конечно, проще. Я понимаю, что семья – это дополнительный фактор риска.

– Егор, а сколько вам лет?

– 39.

– А почему не женаты?

– Да не срослось как-то раньше. А сейчас я больше рисковый, чем завидный жених… (*Смеется.*)

– У многих сегодня упадническое настроение, а вы бодры, шутите. Прямо вне мейнстрима!

– Мне кажется, беда в том, что нас воспитывали на русских сказках, где все ждут какого-то чуда. Вот и у нас некоторые ждут чуда – то на план «Перамога» надеются, то на «День икс», то на выборы. Все это чушь!

Работа и терпение – вот что нужно для достижения цели. Это то, что испокон веков было свойственно белорусам. И тогда плевать, что происходит вокруг. Эмоциональная черствость белорусов – это, наоборот, большой плюс. А все сейчас повторяют: ой-ёй, ничего не получилось! И эта дурацкая депрессия всё как раз и портит. Люди не понимают, что каждый день нужно делать какие-то мелкие шаги, идти к своей цели, работать. А не надеяться на чудо, на Байдена или еще какого-то лидера. Делайте простые вещи. Например, перетяните одного «ябатьку» на свою сторону. И это уже будет маленькая победа!

– У белорусского барда Дмитрия Бартосика как раз есть об этом строки в песне: *«Я спаць кладуся з дзевачкай прастой, а прасынаюся са шчырай беларускай».* Вы об этом?

– Да, это отличный подход!

Но у многих в головах всё равно надежда на какие-то планы, лидеров. Хрен пойми на кого белорусы надеются, только не на себя! И еще вот эта привычка: если режим не побежден до сегодняшнего дня, значит, всё пошло прахом. И вот это нытье транслируется сегодня кругом, и получается, что иррациональному страху и панике подвержено слишком много людей. Это как вирус. Такая ситуация, между прочим, выгодна власти.

– До конца не ясно, чего пытаются добиться репрессиями. Как вам идея переговоров с властью?

– А никаких переговоров не будет. Переговоры – это капитуляция. На другие переговоры никто не пойдет. А когда всех раздербанят, то и переговоров никаких не надо будет. Надо понимать психологию чиновников. Любая либерализация для Лукашенко сегодня – это прямая угроза, поэтому и бомбят все медиа, аналитиков и прочих. Он понимает, что вертикаль пошла шататься. Ведь чиновники тоже читают альтернативные медиа, умеют думать. Вот даже недавнее выступление на совещании с работниками МИДа, где Лукашенко заявляет дипломатам: *«Или вы с народом, страной, президентом, или такие кадры стране не нужны…»* Это не просто так было сказано.

Некоторые не понимают, что основное разложение идет в системе власти. Процесс, может, медленно, но идет. Поэтому я и говорю: сегодня каждый должен делать то, что может. Перетянуть на свою сторону «ябатьку». Рассказывать то, что происходит, тем, кто мало интересуется политикой. Больше ни от кого ничего не требуется. Но поскольку в голову вбивается, что это всё равно ничего не меняет, то никто ничего не делает и все вокруг депрессуют.

Терпение – это то качество, которое всегда было присуще белорусам. Не зря же говорили: «Памірай, а жыта сей». Что бы ни происходило – надо идти вперед! Это кажется, что это какая-то тупая философия, но на самом деле это основа побед. Капля камень точит.

– И раньше в некоторых семьях были разлады из-за политики, а сейчас так особенно. Ваши родные в этом смысле вас поддерживают?

– Мой отец умер, а мама раньше пыталась меня переубедить в каких-то вещах, а сейчас сама понимает, что не надо молчать, иначе только хуже будет.

Марина КОКТЫШ.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

Указ о призыве на срочную военную службу в августе–ноябре уже подписан

В августе–ноябре 2021 года на срочную военную службу и службу в резерве призовут граждан Беларуси мужского пола, которым ко дню призыва исполнилось 18 лет и которые не имеют права на отсрочку, а также граждан призывного возраста, утративших право на отсрочку, – в целях поддержания боевой готовности Вооруженных Сил, других войск и воинских формирований.

Одновременно, как сообщает *belta.by*, указом предусматривается увольнение в запас военнослужащих срочной военной службы и резервистов, выслуживших установленные сроки.

ЛІЧБА

667

За статусам бежанцаў да польскіх улад у першай палове 2021 года звярнуліся 667 беларусаў.

РЭЗАНАНС

Хай бы гісторык Марзалюк напісаў аб трагедыі ў Докшыцах і Азарцах

Пасля прачытання артыкула Міхася Скобла «Вайна малаціла беларусаў у два цапы – і спераду, і ззаду» («Народная Воля» за 1 чэрвеня) і мне захацелася сёе-тое ўспомніць з часоў мінулай вайны.

У 1943 годзе я, падлетак, жыў у мястэчку Докшыцы, што на Віцебшчыне. Разам з немцамі тады ў нас атабарыліся гэтак званыя «радзівонаўцы». Іхні камандзір беларус Уладзімір Гіль-Радзівонаў быў падпалкоўнікам Чырвонай Арміі. Трапіўшы ў нямецкі палон, ён, як і рускі генерал Уласаў, згадзіўся супрацоўнічаць з гітлераўцамі. Праз пэўны час зразумеў, што вайну немцы не выйграюць, трэба неяк ратавацца. Звязаўся з партызанамі, дамовіўся, што «радзівонаўцы» здадуць ім Докшыцы.

У выніку партызаны ўзялі мястэчка без вялікіх страт, немцаў пастралялі. Але потым дзейнічалі зусім не як вызваліцелі. За два дні і ноч партызаны абрабавалі мястэчка, забралі ў людзей шмат маёмасці. На маіх вачах адзін з партызанаў сцягнуў з бацькі боты і верхнюю вопратку. Пасля рабункаў «народныя мсціўцы» ўчынілі падпал. Згарэў драўляны касцёл, а вось мураваная царква ацалела.

На гэтым партызаны не спыніліся. Некаторых местачкоўцаў забілі без суда і следства. Помню, што застрэлілі нашых суседзяў – Ляговіча і Квачонка (у Ляговіча засталіся дзве маленькія дачушкі – Хрысціна і Данута, мы потым разам раслі). Была цалкам знішчана сям’я вядомага ў мястэчку натарыуса (прозвішча, на жаль, не памятаю). Пасля рабункаў і забойстваў партызаны сышлі ў лес.

На другія суткі з Глыбокага (30 вёрст ад Докшыцаў) прыехалі немцы. Жыхарам мястэчка было загадана сабрацца на плошчы. Усе чакалі самага горшага, але гітлераўцы чамусьці зліталіся. Пазней людзі гаварылі, што пасля партызанскага нападу выжыў адзін немец і расказаў сваім супляменнікам, што местачкоўцы не вінаватыя. Такім чынам ён выратаваў нас ад пагібелі.

Пасля трагедыі ў Докшыцах мне давялося жыць у бабулі на хутары, які знаходзіўся каля вёскі Дзегцяры (сёння ў Крыпульскім сельсавеце Докшыцкага раёна). На хутары я таксама наглядзеўся, што вытваралі некаторыя партызаны. Апісаць словамі немагчыма, што бачылі мае вочы...

Паміж Докшыцамі і чыгуначнай станцыяй Параф’янава знаходзілася вялікая вёска Азарцы. На ўездзе ў вёску партызаны яўна з правакацыйнай мэтай заклалі міну, на якой падарваўся нямецкі аўтамабіль. Гітлераўцы акружылі Азарцы, усіх жыхароў забілі, а вёску спалілі датла. Яна так і не аднавілася. Скажыце, партызаны не ведалі, што з-за аднаго ці двух фашыстаў пацерпіць уся вёска? Ведалі, але такім чынам яны разлічвалі, у адпаведнасці інструкцыяй з Масквы, “падняць дух супраціўлення” насельніцтва ўсёй акругі. І на маё разуменне, у знішчэнні ні ў чым не павінных людзей аднолькава павінны як тыя, хто, знаходзячыся ў Маскве, кіраваў партызанскім рухам на тэрыторыі Беларусі, так і фашысты, якія акупіравалі наш край і змагаліся з партызанамі.

Праўда пра ваенныя падзеі ў Докшыцах і Азарцах да гэтага часу нідзе не апублікавана. А шкада. Хай бы гісторык Ігар Марзалюк, які часта выступае па тэлебачанні, расказаў людзям, што часам вытваралі некаторыя партызаны, якіх усіх без разбору гераізуюць афіцыйныя СМІ. Не, я згодны з тым, што ў большасці сваёй удзельнікі партызанскага руху заслугоўваюць гонару і павагі, але ж нельга замоўчваць і пра тое, што з-за бязглуздых дзеянняў некаторых з іх многім мірным жыхарам давялося заплаціць сваімі жыццямі.

Мне ўжо пад дзевяноста гадоў, жыццё падходзіць да фінішу. Не хацелася б, каб праўда пра трагічныя падзеі ў Докшыцах і Азарцах сышла са мной на той свет…

Барыс СТАРЫКЕВІЧ.

Мінск.

ВЕРДЫКТ

Суд у Чэхіі асудзіў беларуса на 21 год турмы за ўдзел у вайне ў Данбасе

Апеляцыйны суд у Чэхіі асудзіў 41-гадовага беларуса **Аляксея Фадзеева** на 21 год турмы за ўдзел у вайне на ўсходзе Украіны на баку прарасійскіх сепаратыстаў. Ён прызнаны вінаватым у тэрарызме. Пра гэта паведамляе Novinky. cz.

Фадзееў шмат гадоў жыве ў Чэхіі. З кастрычніка 2014-га па травень 2016 года ён неаднаразова выязджаў у Данбас з мэтай падтрымкі сепаратысцкіх груповак і служыў ва ўзброеных сілах аднаго з сепаратысцкіх утварэнняў.

Суд першай інстанцыі асудзіў яго за гэта на 4,5 года пазбаўлення волі. Тады суддзя палічыла, што Фадзееў не прымаў удзел у баях і вёў толькі дапаможную працу. Аднак пракуратура абскардзіла гэтае рашэнне.

Абарона беларуса настойвала, што з яго трэба зняць абвінавачанні, бо ён, як сцвярджаецца, не ўдзельнічаў у баях на перадавой. Сцвярджалася, што Фадзееў паехаў ва Украіну для абароны мірнага насельніцтва.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
27 ЛІПЕНЯ 2021 г.

ДРАМА

«Я муху не пакрыўджу, калі да мяне нармальнае стаўленне...»

Гісторыя малалетняга палітвязня Мікіты Залатарова, двойчы судзімага пасля выбараў

Бацька малалетняга палітвязня Мікіты Залатарова нарэшце атрымаў спатканне з сынам. Гэта адбылося пасля другога суда над падлеткам. Гомельская Феміда прызнала Мікіту вінаватым у «гвалце» над ахоўнікамі СІЗА і пакарала паўтара гадамі зняволення ў выхаваўчай калоніі. Апроч таго, хлопец мусіць сплаціць пацярпелым маральную шкоду – тысячу рублёў на дваіх.

– Нягледзячы на ўсё, сын трымаецца бадзёра, -- кажа Міхаіл Лапуноў, бацька Мікіты. -- Але ў СІЗА да яго чапляюцца, спрабуюць справакаваць. Ён хоча хутчэй патрапіць у калонію. Таму апеляцыю на апошні прысуд пісаць не будзем. Няма сэнсу. Мікіта змучаны камерным рэжымам і канвойнымі – рыхтуем яго зараз да этапу ў калонію.

«Не гвалт, а супраціўленне»

14 ліпеня суд Цэнтральнага раёна Гомеля другі раз асудзіў хворага на эпілепсію падлетка Залатарова. Гэтым разам на падставе артыкула 364 Крымінальнага кодэкса.

Што ж такога крымінальнага зрабіў у СІЗА невысокага расточку падлетак, прызнаны праваабарончымі арганізацыямі палітвязнем?

Следчы **Шкрабаў** з гарадскога аддзела СК пісаў у пастанове: *«21 сакавіка ў праме-жак часу з 11:30 да 12:30 Залатароў, будучы ў службовым кабінеце псіхалагічнай службы, у катэгарычнай форме адмовіўся выконваць законныя патрабаванні супрацоўнікаў установы – прайсці ў камеру № 103, у выніку чаго супрацоўнікі* ***Лучкін*** *і* ***Хацкоў*** *прымянілі да яго фізічную сілу і вывелі ў калідор трэцяга паверха».*

Аднак непаўналетні Залатароў, адзначаецца ў абвінавачванні, перашкаджаў законнай дзейнасці службоўцаў. Хлопец зрабіў падножку Лучкіну, у выніку чаго той зваліўся на падлогу. Калі Лучкін падняўся, Залатароў «схапіў яго за валасы і шыю, прычыніўшы тым самым боль і пабоі».

Апроч таго, лаяўся і пагражаў гвалтам намесніцы начальніка ізалятара **Тацццяне Хаўбок**. На судзе супрацоўніца абуралася: яна ўсё ж такі падпалкоўнік, намесніца начальніка, а Мікіта – малалетка, асуджаны, брыдка абзываўся ды яшчэ пагражаў.

Залатароў на судзе не адмаўляў віны, аднак удакладніў: *«Гэта быў не гвалт, а супраціўленне. Кепскія словы я казаў на эмоцыях».*

І дадаў, што да яго ставіліся кепска, негуманна з той прычыны, што асуджаны па «палітычных» артыкулах. Ён хварэе на эпілепсію, а таблеткі давалі не рэгулярна, іншы раз толькі тады, калі была магчымасць непасрэдна звярнуцца да медыка. Да таго ж адзін сядзеў у камеры каля двух месяцаў. І баяўся: пачнецца прыступ, хто дапаможа?

– Калі адзін сяджу, мяне пачынае «падрываць», – прызнаваўся Мікіта.

Прэлюдыя інцыдэнту, паводле распове-ду Залатарова, такая. 20 сакавіка ён прасіў праз «калідорнага», каб яму падсялілі нармальнага сукамерніка. Апроч таго, камеру 103, у якой Мікіта знаходзіўся, з-за няспраўнай сантэхнікі заліло «па костачку» вадою і нават нечыстотамі. Прынамсі, так сцвярджаў падлетак.

Мікіту завялі на «боксы», а потым даставілі да псіхолага **Зіновіча**. У яго кабінеце падлетак правёў ноч, а на раніцу заўпарціўся вяртацца ў сваю ранейшую камеру, дзе «брудна» і «поўзаюць прусакі».

Паўшчуваць і наставіць падлетка на спакойны лад прыходзіла Тацццяна Хаўбок і начальнік СІЗА **Рубанаў**. Але Мікіта не хацеў вяртацца ў камеру, лічачы, што з яго здзекуюцца.

Намесніца начальніка Хаўбок, у сваю чаргу, казала на судзе, што Мікіта сам разліваў ваду, бо раззлаваўся, што бацькі не прывезлі перадачу, якую нібыта меліся даставіць яму ў суботу, 20 сакавіка. А не падсялялі да падлетка таму, што ён «канфліктны», схільны «да агрэсіі», не ўжываецца з сукамернікамі. Пра канфліктнасць падлетка гаварыў і Лучкін, таму, маўляў, і напарніка даводзілася перавесці з камеры ў іншую.


Мікіта Залатароў у судзе Цэнтральнага раёна.

– Ага, падсялілі да мяне нейкага «пед...ка», ён жа сваімі прычындаламі круціў. І чаму я павінен з такімі «кукарэкушкамі» сядзець? – тут жа адрэагаваў падлетак.

Вынеслі з кабінета псіхолага

Паколькі Мікіта і па патрабаванні начальніка СІЗА не хацеў вяртацца ў камеру 103, той выклікаў ахоўнікаў Лучкіна і Хацкова. Яны пад рукі вынеслі Залатарова з кабінета. Мікіта супраціўляўся, лаяўся. Яму сталі закручваць рукі. Падлетак крычаў, вырываўся, брыдкасловіў.

– Я хацеў вызваліцца, каб руку не заломвалі: было балюча. Хацеў, нармальна ўсё вырашыць, – сцвярджаў невялічкага росту падлетак, якога цягнулі, па яго ж словах, «здаравенныя дзядзькі».

У такой сумяціцы Залатароў і зрабіў падножку Лучкіну. Апошні кажа, што наўмысна. Мікіта сцвярджае, што выпадкова, у запале, бо «не цяміў, што рабіў». Ахоўнік упаў па падлогу разам з падлеткам.

Залатароў заяўляў на судзе, што і ўдараў ніякіх ён не наносіў Лучкіну, за адзене і валасы не хапаў, а толькі ў валтузні пальцамі «зачапіў маску, і яна зляцела».

Пра муху і крыўду

Праз падзенне ў Лучкіна выпаў індывідуальны відэарэгістратар. Яго падняла Тацццяна Хаўбок і стала працягваць здымкі. Паўплывала гэта на Мікіту ці не, але і на яе адрас падлетак адпусціў пару зусім не ласкавых слоў, ды яшчэ з пагрозамі: «Выйду, спалю!».

На судзе прыгадаў, што Хаўбок груба размаўляла з ім у кабінеце псіхолага. Калі ў судзе дэманстравалі відэа інцыдэнту, падлетак раз-пораз наіўна ўсміхаўся. Выглядала, што пацяшаўся: яму не соладка, але і ён у даўгу не застаўся.

– Каб я хацеў каму сапраўды нашкодзіць, то ў камеры хапае ўсякіх жалезак, не закручаных гаек... Я добры чалавек. Я муху не пакрыўджу, калі да мяне нармальнае стаўленне, – запэўніваў на завяршэнне Мікіта.

Канешне, ахоўнікі перад камерай 103 усё ж скруцілі падлетка, надзелі кайданкі і прыціснулі яго галаву да падлогі. Потым паставілі яго да сцяны і хвілін праз дзесяць завялі ў камеру.

«Хіба сябе на органы прадаць?»

Тацццяна Хаўбок і Мікіта Лучкін як пацярпелыя супрацоўнікі СІЗА выставілі абвінавачанаму падлетку кампенсацыю маральнай шкоды – па тысячы рублёў для кожнага. Паколькі Залатароў непаўнагадовы, то кампенса-


Бацькі Залатарова.

цыя аўтаматычна кладзецца на бацькоў. Пачуўшы пра згаданую суму, маці падлетка Лілія Залатарова (яна ў судзе і законны прадстаўнік сына) у чарговы раз заплакала.

– Я страціла працу, у мяне няма такой сумы. Хіба сябе на органы прадаць? – уголас пыталася Лілія Эдуардаўна.

Суддзя Віктар Казачок зменшыў напалову суму кампенсацыі супрацоўнікам ізалятара і на шэсць месяцаў у параўнанні з запытам дзяржабвінаваўцы з пракуратуры – тэрмін пакарання Мікіты нявольнай.

Бацька Мікіты, каментуючы чарговую крымінальную справу супраць сына, не здзіўляецца яго нястрыманым паводзінам.

– Не дзіва, што сын там нешта крычаў ды лаяўся. Ён ведае, што сядзіць несправядліва, незаконна. За што яго было яшчэ раз судзіць? Яго ўтрымліваюць як закладніка. І што ён павінен гаварыць: «Дзякуй», «Выбачайце»? Тое, што яму не даюць рэгулярна патрэбныя прэпараты, можа скончыцца плачэўна. У такой сітуацыі ў сына наогул мяняецца псіхіка. Уявіце, ён амаль год сядзіць у бруднай цёмнай камеры. Яны яго гнятуць, а ён не маўчыць. Не кожны дарослы такое вытрымае, – кажа Міхаіл Лапуноў.

З улікам змен у заканадаўстве падлетку пералічаны тэрмін, які ён правёў у СІЗА да суда (дзень у СІЗА за два дні ў калоніі для непаўналетніх), і ў выніку Залатароў будзе сядзець яшчэ 4,5 года.

«Кактэйль Молатава», якога не было

Нагадаем, што сёлета ў лютым суддзя Цэнтральнага раёна **Дзмітрый Дзэбой** пакараў падлетка Залатарова 5 гадамі пазбаўлення волі ў выхаваўчай калоніі за «масавыя беспарадкі» ў жніўні 2020 года і супраціў міліцыі з выкарыстаннем «кактэйлю Молатава», хоць ніякіх «кактэйляў» і наогул чаго-кольвечы падлетак у бок міліцыі не кідаў.

Міліцыя затрымала Мікіту 11 жніўня мінулага года дома, калі бацькоў не было. Быў толькі старэйшы брат. Вывелі 16-гадовага падлетка ў адных майтках. Суседзі абурыліся, сарамацілі міліцыянтаў. І толькі пасля гэтага хлопцу дазволілі адзецца.

«Мікіту забралі раніцай, а вечарам ён апынуўся ў рэанімацыі абласной дзіцячай бальніцы на вуліцы Жаркоўскага», – распавядаў у жніўні бацька Мікіты.

На сваю бяду падлетак увечары 10 жніўня паехаў у цэнтр горада, дзе праходзілі пратэстныя маршы супраць фальсіфікацыі выбараў і гвалту сілавікоў. У тралейбусе ўбачыў Леаніда, якому прыяцель Мікіты даводзіцца пляменнікам – той ехаў у цэнтр зняць «крутое відэа» для сайта «ЧП Гомель», а Мікіта з прыяцелем – падзівавацца.

На цэнтральнай плошчы амапаўцы ўжо разганялі пратэстоўцаў, і хлопцы разбегліся. Знайшліся аж на праспекце Леніна. Там да іх далучыўся Дзмітрый, 25-гадовы жыхар Добруша. Неадназаова быў судзімы, прыехаў у Гомель і меў бутэльку з гаручай вадкасцю. Акурат Дзмітрый, як высветлілася на судзе, і кідаў бутэльку (па версіі следства – «кактэйль Молатава») у бок міліцыянераў, калі тыя выскачылі з мікрааўтобуса, каб «зачысціць» праспект паблізу вакзала. Бутэлька не ўзарвалася, бо ў ёй не было кнота – Дзмітрый наогул нічога не падпальваў. Ніхто ад той бутэлькі не пацярпеў, нікому з міліцыянераў нават чаравікі не запырскала. Гэта было ўстаноўлена на судзе.

Паводле матэрыялаў следства, экспертыза выявіла на аскепках шкла разбітай бутэлькі сляды бензіну і мінеральнага масла. Аднак эксперты не ўказалі, што бутэлька была "прыведзена ў дзеянне". У абаронцаў фігурантаў справы наогул узнік вялікі сумнеў, што кінутую Дзмітрыем бутэльку з вадкасцю можна прыраўняць ці аднесці да "кактэйлю Молатава".

Адвакатка, якая абараняла ў судзе дабрушаніна Дзмітрыя, адкрыта заявіла, што нават з боку яе падабароннага не было ўзброенага супраціву прадстаўнікам улады, якім, паводле следства, "стала кіданне бутэлькі з вадкасцю ў бок супрацоўнікаў міліцыі". Чаму? Няма спраўджаных доказаў, што бутэлька – сапраўды "кактэйль Молатава". Абвінавачванне цалкам пабудавана на дапушчэннях і здагадках, і асабліва гэта бачна на прыкладзе прэтэнзій да Мікіты Залатарова.

Ніяк не зафіксаваны ў крымінальнай справе і масавыя беспарадкі. Ні воклічаў, ні фаераў, ні шэсцяў, ні перашкодаў руху. Наадварот, гараджане спыняюцца на сігналы святлафораў, звыкла ездзіць па вуліцах транспарт.

Але міліцыянты даклалі ў «дзяжурку», што быў «кактэйль Молатава». Леаніда затрымалі, высветлілі, што ён тэлефанаваў Залатарову ў пошуках пляменніка.

Назаўтра затрымалі Залатарова. Следства стала раскручваць крымінальную справу пра «гвалт у дачыненні міліцыі» з прымяненнем «кактэйлю Молатава». Выглядала, што і ў Мікіты была бутэлька з нейкай вадкасцю, якую ён выкінуў у сметніцу па дарозе дадому. Ніхто той бутэлькі не знайшоў і не даследаваў. Тым не менш, падлетка разам з іншымі двума фігурантамі абвінавацілі ў актыўным удзеле ў «масавых беспарадках» і «супраціве міліцыі» з прымяненнем «кактэйлю Молатава».

Суд адмераў Залатарову 5 гадоў выхаваўчай калоніі. Старэйшыя фігуранты гэтай справы атрымалі яшчэ болей: Леанід – 6 гадоў няволі, Дзмітрый – 8.

Пасля абвяшчэння прысуду Мікіта ўпаў у істэрыку, кінуўся на краты судовай «клеткі» з крыкам: «Выпусціце мяне адсюль!».

Закладнік несумленных выбараў

Бацькі Мікіты Лілія Залатарова і Міхаіл Лапуноў перакананы: сын не сядзеў бы ў СІЗА і наогул не было б падобных судоў, калі б у краіне былі справядлівыя выбары.

– Наш Мікіта не злачынца, ён закладнік, – не перастае паўтараць Міхаіл Рыгоравіч.

А пачалося ўсё на тле пратэстаў супраць несумленных выбараў. Мікіту схапілі, абвінавацілі ў кіданні «кактэйлю Молатава», білі. Падлетак, хворы на эпілепсію, апынуўся ў рэанімацыі. Потым знайшоўся іншы чалавек, які сапраўды кідаў бутэльку з нейкай вадкасцю.

– На той час Мікіта сядзеў у ізалятары ўжо два месяцы, – зазначае Лапуноў. – Сына трэба было вызваляць. Але хто возьме на сябе адказнасць за тое, што дзіця сядзіць за кратамі ўжо два месяцы, што з яго здзекуюцца, не даюць патрэбных лекаў? Гэта ж параза ўсёй прававой сістэмы, якой «не да законаў».

Міхаіл з Ліляй перакананы, што сын не ў СІЗА мусіць сядзець, а лячыцца ў бальніцы, вучыцца ў дзевятым класе, а не засвойваць у нялюдскіх умовах "турэмныя ўніверсітэты».

– Калі б выбары ў краіне былі сумленнымі, дэмакратычнымі, – дадае Міхаіл Лапуноў, – ніхто б не пацярпеў, не было б паламаных лёсаў беларускіх грамадзян. Ніхто б не памёр, не ляжаў у шпіталях, не сядзеў бы ў турмах. І эканоміка мела б развіццё. Цяпер маем трагічныя наступствы.

І ў словах бацькі падлетка свая сярмяжная праўда.

Анатоль ЛІПСКІ. Фота аўтара.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Ужо й за аркуш чысты караюць нас службісты

Падставай для складання адміністрацыйных пратаколаў усё часцей становяцца чыстыя аркушы паперы фармату А4, вывешаныя на вокнах дамоў. Нядаўна, напрыклад, суд аштрафаваў мінчанку на 2320 рублёў.

Здавалася, што ўжо нарэшце
Горш не прыдумаюць яны:
Караць людзей, нібы за шэсце,
За бел-чырвоныя штаны.
Але яны трымаюць марку,
Імпэт не здзьмуўся, не зачах.
Ужо й паперы чысты аркуш
Крамолай стаў у іх вачах:
Як чалавек паперу тую
Прыклеіў дома на акне,
Дык ён, выходзіць, пратэстуе,
А заўтра, можа быць, пачне
Міліцыянтаў браць за грудзі
І нават штурмаваць турму;
Няхай за гэта нашы суддзі
Авансам штраф дадуць яму.
Прадбачу, што на даляглядзе
Намнога горшыя часы:
Любы ў турму, магчыма, сядзе
І проста за пагляд касы…
***
Перада мною – чысты аркуш.
Хоць не на шкле аконным ён,
Ды, каб не атрымаць па карку,
На ім накрэмзаў фельетон…

Як зірнеш са стараны, кожны п'яны – што дурны

У лідскім рэстаране 36-гадовы мужчына спрабаваў заляцацца да дамы, аднак без поспеху. Каб яна звярнула на яго ўвагу, мужчына схапіў крэсла і запусціў у маладзіцу, нанёсшы ёй лёгкія цялесныя пашкоджанні.

Калі мужык у рэстаране
Гарэлкаю заліў нутро,
Дык для яго й лахудра стане
Падобнай на Мэрлін Манро.
А тут такая каралева,
Такі на даме бляск і шык,
Што пагадзіўся б з ёй «налева»
Схадзіць, бадай, любы мужык.
Стаў сапраўды мужык падпіты
Да дамы падбіваць кліны.
Хоць не адпрэчыла: «Ідзі ты…!» –
Ды «каралева» хоць бы хны,
І на яго як на мужчыну
Яна не пазірала нат.
«Калі ў цябе я крэсла кіну,
Дык кінеш на мяне пагляд!
Ацэніш годна мой учынак!» –
Ідэя цюкнула ў глузды.
Паверыць цяжка, ды мужчына
Яго шпурнуў і сапраўды.
Гадаюць міліцыянеры,
Не могуць вырашыць яны:
Ці ён на грудзі ўзяў без меры,
Ці проста ўвогуле дурны?
***
Калі жанчыне ты не любы
І перспектывы не відно,
Дык хоць ты трэсні ёй у зубы –
Не пакахае ўсё адно…

Анекдоты як навіны

Хоць не прастакі, не ідыёты
Людзі «сінявокае краіны»,
Ды апошнім часам анекдоты
Успрымаюць часта як навіны…

А ў дэпутата якая зарплата?

Казаў народ пра дэпутата:
– Ён пра даходы нашы плёў…
А сам пражыў бы, каб зарплата
Была ў яго пяцьсот рублёў?
Хадзіў бы, мусібыць, пануры,
Не балбатаў бы гэтак шмат,
Каб пабываў у нашай шкуры…
І ўсім абвесціў дэпутат:
– Каб у людзей не знікла вера
Ка мне, той выклік я прыму.
Аднак падобная вячэра
Не спадабалася яму…

Калі конь сказаў…

Так законны псіхіятр даклад,
Выкліваўшы ў зале весялосць:
– Калі конь сказаў, што ты вар'ят,
Значыць, безумоўна, так і ёсць…

НЕСТАНДАРТ

«Семейные экипажи – самые надежные»

Супруги из Минска – о работе дальнобойщиками в Европе









«Прикольно, давай учиться»

Для Дмитрия работа водителем – дело не новое. В Беларуси он уже занимался грузоперевозками, ездил на грузовике категории «С». Однако у него давно были мысли открыть категорию «Е» и пойти в дальнобойщики, но первая жена не поддерживала эту задумку.

В то же время для Александры уйти в дальнобойщики означало решиться на куда более серьезные изменения. До этого она 15 лет работала парикмахером, а в «правах» у нее была только категория «В».

«Как-то в одном из разговоров Дима обмолвился, что уже достаточно давно хотел сдать на категорию «Е» и пойти работать на фуру. Я поддержала и сказала, что сама не против поездить и попробовать себя в этой профессии. Опыт езды на легковом авто был, и ездить за рулем я никогда не боялась. Дима сказал, что было бы прикольно: мол, давай учиться», – вспоминает Александра.

После принятия достаточно спонтанного решения молодые люди отправились в автошколу. Дмитрию не хватало только категории «Е», а Александре сперва нужно было получить «С», а уже только потом учиться на «Е».

Девушка рассказывает, что только ожидание начала учебы заняло три месяца. Поэтому, затеяв всё это в начале весны прошлого года, грузовую категорию она получила лишь в августе, а категорию «Е» – аж в ноябре. Зато оба экзамена Саша сдала с первого раза.

Для работы на фуре наличия только буковки в правах недостаточно. Поэтому будущую дальнобойщицу ждали расходы на получение чипа и удостоверения водителя-международника. Вдобавок из-за отсутствия опыта у Александры с совместным трудоустройством возникли трудности.

«На тот момент, не считая нескольких лет работы на грузовике без прицепа, у мужа уже был почти годовалый опыт езды на фуре, а вот мне нужно было стажироваться. Естественно, мы хотели, чтобы именно он меня учил, но, к сожалению, при поиске вариантов часто сталкивались с тем, что все хотели посмотреть хотя бы 3–6 месяцев на то, как работает Дима, а уже потом были готовы отправлять нас вместе. Некоторые предлагали мне стажироваться с другими водителями, уже давно у них работающими. Естественно, такой вариант нас не устраивал... Поиск работы слегка затянулся. Мы сразу были нацелены именно на Европу, потому как там платят посуточно, а в СНГ – от «колеса». Кроме того, мы не хотели устраиваться в абы какую фирму, а рассматривали сразу хотя бы среднее по рейтингу и уровню зарплат.

В итоге все же нашли литовскую фирму, которая поверила в мужа и согласилась нас взять. Перед тем как нанимать водителей, компания проводит с каждым кандидатом тест-драйв, чтобы понять, стоит ли вообще иметь дело с этим человеком. Дима все сдал на отлично, я была второй, и единственное, что я попросила, – это чтобы муж оставался в кабине», – вспоминает Саша.

Следующим этапом было обучение на 95-й код. Учебу организует сама фирма. Стоимость курса – 350 евро, курсантам предоставляется бесплатное общежитие; питание и досуг идут за свой счет. Плату за обучение в данной организации не берут, а высчитывают из первой зарплаты. Вывод: тем, кто желает сесть за руль фуры, но не имеет прав нужных категорий и других «корочек», нужно быть готовым, что на все движения могут уйти без малого год и более 1000 евро.

«Фура – это не страшно!»

Дмитрий – глава экипажа, за сутки работы ему платят 65 евро, а его менее опытной напарнице-супруге – 60. Правда, первый месяц считалось, что Александра стажируется, поэтому ей платили по 21 евро. Она признается, что новая работа ей нравится, нахождение за рулем фуры не вызывает страха, а, наоборот, дает только положительные эмоции.

«За рулем фуры буквально первые пару дней ощущала, что машина высокая и огромная, а сейчас чувствую себя как будто за рулем джипа, не больше. Фура – это не страшно! Я считаю, что женщинам, которые не боятся автомобиля, стоит идти со своими дальнобойщиками в эту профессию. В Европе девушка за рулем большегруза не такая уж редкость. Семейные пары тоже встречаются. Некоторые работодатели и вовсе считают, что семейные экипажи – самые надежные, поэтому с удовольствием берут их на работу. Главное, чтобы был опыт.

Из минусов такой работы для девушек я отметила бы лишь нехватку душевых в Бельгии и Голландии. В других странах проблем с этим нет.

Постоянное нахождение вместе нас не напрягает, хотя, конечно, бывает, что мы можем немного поругаться, но это происходит даже реже, чем дома в Минске. Возможно, тут многое зависит как от конкретных людей, так и от отношения к профессии. Например, нам обоим она нравится. Многие друзья и знакомые отговаривали нас, говорили, что из-за совместной работы можно и развестись, но нам кажется, что так, наоборот, веселее.

В семейном экипаже есть много плюсов. Например, девушке нужно меньше платьев, туфелек и т.д. – это огромная экономия. Кроме того, нам не надо платить за аренду квартиры и коммуналку», – рассуждает Саша.

Она признается, что по возможности муж ездит за рулем больше, чем она. Она же готовит ему бутерброды, салаты, варит кофе и т.д. Из плюсов отмечает отсутствие ревности с обеих сторон, ведь молодые люди постоянно вместе, а не как это бывает, когда мужчина в рейсе и пара месяцами не видит друг друга.

«Наш досуг не сильно отличается от прежнего. Есть много стоянок, где можно пожарить шашлыки или заняться спортом. Недавно с мужем обсуждали, что и путешествовать нам уже нет смысла, если только выбирать пляжный отдых. За эти три месяца мы увидели много красивых мест: потрясающие горы, старинные замки, домики, мосты.

Удалось побывать на пляже, пробовали настоящую итальянскую пиццу. Видели Эйфелеву башню, пили французское вино, ели французские сыры, круассаны и т.д. Для любителей путешествий это идеальная работа!» – считает Александра.

Молодые люди ездят уже три месяца и заканчивать каденцию пока не планируют. С учетом ситуации с выездом за границу опасаются, что могут застрять в Беларуси и в итоге остаться без денег и работы.

«Наверное, будем ездить, пока не закончится срок действия визы. Ограничения по выезду и проблемы с перелетами сильно отразились на белорусских дальнобойщиках в Европе. Например, у нас есть украинские коллеги, которые не смогли вовремя смениться из-за того, что второй экипаж – тоже семейная пара из Беларуси – не может выехать из страны из-за ограничений и отсутствия авиасообщения с Европой», – рассказывает Александра.

Среди знакомых пары многие ушли в дальнобой либо планируют это сделать.

«Знаю еще одну девушку из автошколы, которая также уже работает водителем фуры. Кстати, инструктор, который учил меня ездить с прицепом, тоже готовит документы и нацеливается на работу в Европе. Кроме того, мы завели с мужем аккаунты в TikTok и там рассказываем о своей жизни и работе. Нам пишет немало людей, которые хотят сменить профессию. Благодаря TikTok мы узнали, что семейных экипажей не так уж мало. В будущем, возможно, заведем канал на YouTube, где будем более подробно рассказывать о семейной жизни в кабине и делиться советами и полезной информацией».

Владимир АПЛЕВИЧ.

Фото предоставлены героями публикации.

ЯНЫ – ПРА НАС

Аўшрына АРМАНАЙЦЕ, міністр эканомікі і інавацый Літвы:

«Ужо 43 беларускія IT-кампаніі знайшлі ў нас бізнэс-прытулак»

Нямецкая газета Die Welt змясціла інтэрв'ю з міністрам эканомікі і інавацый Літвы Аўшрынай Арманайце. Вось фрагменты, якія датычаць Беларусі:

– Ваша краіна зрабіла незвычайны для Еўрасаюза крок: вы не толькі даяце палітычнае прыстанішча людзям з суседняй Беларусі, якія пераследуюць за іх палітычныя перакананні, але і своеасаблівы бізнэс-прытулак для кампаній, якія хочуць пакінуць Беларусь. Чаму так адбылося?

– На нас як на суседнюю краіну моцна ўплывае тое, што адбываецца ў Беларусі. І не таму, што гэта нешта прынцыпова новае: ужо 10 гадоў таму, яшчэ студэнткай, я разам з многімі сваімі калегамі-студэнтамі пратэставала супраць рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. У адрозненне ад таго часу цяпер у Беларусі ёсць новае пакаленне, якое вельмі актыўна паўстае супраць дыктатуры. Гэта нас натхняе, і мы хочам дапамагчы. Так, мы нядаўна прынялі папраўкі да закону, якія аблегчаць магчымасць асталявацца тут кампаніям з трэціх краін, з-за межаў ЕС. Запрашэнне адрасавана не толькі беларускім кампаніям, але ў гэты момант – асабліва ім.

– Як гэта канкрэтна выглядае на практыцы?

– Папраўкі прадугледжваюць, што кампаніі, якія жадаюць пераехаць сюды, без дадатковых працэдур змогуць перасяляць сюды сваіх супрацоўнікаў і іх сем'і. Попыт высокі. Да гэтага часу ўжо 43 беларускія кампаніі пайшлі на гэты крок і яшчэ каля сотні выказалі сваю зацікаўленасць. Зараз найбольш запытаў паступіла ад індустрыі IT і гульняў. Мы ўжо сталі новым домам для найбуйнейшага беларускага стартап-цэнтра, які аб'ядноўвае 250 маладых кампаній.

– «Адток мазгоў», магчыма, яшчэ больш аслабіць беларускую эканоміку. Вы сапраўды імкняцеся да такой дэстабілізацыі?

– Мы разглядаем нашу прапанову як пэўную форму надання прытулку. Але прытулак – гэта не доўгатэрміновае рашэнне. Калі б сітуацыя ў Беларусі палепшылася, большасць гэтых кампаній зноў вярнулася б на радзіму. Гэта таксама важна для нас, і мы хочам мець дэмакратычнага і эканамічна паспяховага суседа. Аднак мы цяпер вельмі занепакоеныя тым, што адбываецца ўсяго за 50 км ад вонкавай мяжы Еўрасаюза.

– Рэагуючы на прымусовую пасадку самалёта, калі былі затрыманы журналіст і актывіст Раман Пратасевіч і яго сяброўка Соф'я Сапега, ЕС нядаўна ўзмацніў санкцыі ў дачыненні да краіны. Ці дастаткова гэтага?

